2. Документы и материалы по истории советско-польских отношений. Т. III. М.: Наука, I965.

3. Ленин В.И. Полн. собр. соч. Изд. пятое. Т. 41. М.: Изд-во политической литературы, 1981.

4. Ленинский сборник. Т.XXXVI. М.: Гос. изд-во полит. лит-ры, 1959.

5. Сборник действующих договоров, соглашений и конвенций, заключенных РСФСР с иностранными государствами. Вып. 1. Изд. втор. Петроград, 1922.

6. Сборник действующих договоров, соглашений и конвенций, заключенных РСФСР с иностранными государствами. Вып. II. М., 1921.

7. Чичерин Г.В. Доклад народного комиссара по иностранным делам Г.В.Чичерина на заседании ВЦИК 17 июня 1920 г. Стенограмма. НКИД. М.: Тип. III-го Коммунистического Интернационала, 1920.

8. Ольшанский П.Н. Рижский мир. М.: Наука,1969.

**УДК 94:327(47+57)+438)(094.2)”1920-1921”**

# ПЫТАННЕ АБ ПАЛІТЫЧНЫМ СТАТУСЕ БЕЛАРУСІ НА САВЕЦКА–ПОЛЬСКІХ МІРНЫХ ПЕРАГАВОРАХ

***У.Е. Снапкоўскі***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, ulsnap44@inbox.ru*

Разгледжана пытанне аб міжнародным і палітычным статусе Беларусі на савецка-польскіх мірных перагаворах 1920–1921 гг. У сувязі з гэтым прааналізаваны формы дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі Беларусі (Беларуская Народная Рэспубліка і Беларуская ССР, якая існавала ў некалькіх відах). Адзначана, што ні БНР, ні БССР не ўдалося атрымаць міжнароднага прызнання, хаця дыпламатычная актыўнасць БНР была больш выразнай і прыкметнай. Канстатавана, што дзейнасць урада БССР мела фасадны характар і была залежнай аб РСФСР. Апісана абмеркаванне пытанняў аб палітычным статусе Беларусі і яе прызнанні на савецка-польскіх перагаворах у Мінску і Рызе.

***Ключавыя словы:*** *савецка-польскія мірныя перагаворы; Беларуская Народная Рэспубліка; Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка; Ваенна-рэвалюцыйны камітэт; палітычны статус Беларусі; міжнароднае прызнанне.*

# ВОПРОС О ПОЛИТИЧЕСКОМ СТАТУСЕ БЕЛАРУСИ НА СОВЕТСКО–ПОЛЬСКИХ МИРНЫХ ПЕРЕГОВОРАХ

***В.Е. Снапковский***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, ulsnap44@inbox.ru*

Рассмотрен вопрос о международном и политическом статусе Беларуси на советско-польских мирных переговорах 1920–1921 гг. В связи с этим анализируются формы государственных образований на территории Беларуси (Белорусская Народная Республика и Белорусская ССР, которая существовала в нескольких видах). Отмечено, что ни БНР, ни БССР не смогли добиться международного признания, хотя дипломатическая деятельность БНР была более выразительной и заметной. Констатируется, что деятельность правительства БССР носила фасадный характер и зависела от РСФСР. Описывается обсуждение вопросов политического статуса Беларуси и ее признания на советско-польских переговорах в Минске и Риге.

***Ключевые слова***: *советско-польские мирные переговоры; Белорусская Народная Республика; Белорусская Советская Социалистическая Республика; Военно-революционный комитет; политический статус Беларуси; международное признание.*

# THE ISSUE OF THE POLITICAL STATUS OF BELARUS AT THE SOVIET–POLISH PEACE NEGOTIATIONS

***U. Snapkouski***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus, ulsnap44@inbox.ru*

The issue of the international and political status of Belarus at the Soviet-Polish peace talks of 1920–1921 was considered. In this regard, the forms of state formations on the territory of Belarus (the Belarusian People's Republic and the Belarusian SSR, which existed in several forms) are analyzed. It was noted that neither the BNR nor the BSSR were able to achieve international recognition, although the diplomatic activity of the BNR was more expressive and noticeable. It is stated that the activity of the government of the BSSR had a facade character and depended on the RSFSR. The discussion of the issues of the political status of Belarus and its recognition at the Soviet–Polish talks in Minsk and Riga is described.

***Keywords:*** *Soviet-Polish peace talks; The People's Republic of Belarus; Belarusian Soviet Socialist Republic; Military Revolutionary Committee; political status of Belarus; international recognition.*

Для лепшага разумення палітычнага статуса Беларусі на савецка-польскіх мірных перагаворах у Мінску і Рызе, у якіх, як вядома дэлегацыі БНР і ВРК БССР не ўдзельнічалі, трэба разгледзець вельмі коратка этапы фарміравання беларускай дзяржаўнасці з моманту абвяшчэння незалежнасці БНР 25 сакавіка 1918 г. Паводле сучаснай канцэпцыі гісторыі беларускай дзяржаўнасці, выкладзенай у 5-томнай працы Інстытута гісторыі НАН Беларусі, Беларуская Народная Рэспубліка з'яўляецца першай нацыянальнай формай беларускай дзяржаўнасці, хоць яна была рэалізаваная ў выглядзе незавершанага палітычнага праекта [5, с. 6]. Наступным крокам на шляху да незалежнасці было стварэнне беларускай савецкай дзяржаўнасці, якая ў 1919–1920 гг. прайшла некалькі этапаў станаўлення (ССРБ, ЛітБел, другое абвяшчэнне БССР). Дзеля спрашчэнне нашага аналізу будзем характарызаваць гэтыя тры фазы/этапы адной назвай – Беларуская ССР (БССР).

Да пачатку савецка-польскіх мірных перагавораў у Мінску (жнівень 1920 г.) дзяржаўна-палітычныя структуры БНР (Рада і ўрад) і БССР (Ваенна-рэвалюцыйны камітэт) мелі розны палітычны статус. Урад БНР перайшоў на становішча ўрада ў выгнанні (эміграцыйнага ўрада) і размяшчаўся ў Рызе. Ён зрабіў шмат намаганняў у справе дасягнення міжнароднага прызнання, аднак не здолеў дабіцца ў гэтым цяжкім пытанні якіх-небудзь значных вынікаў. Адзінай дзяржавай, якая прызнала БНР дэ-факта, была Фінляндыя. Аднак фінскі ўрад пад ціскам Вялікабрытаніі ў студзені 1920 г. фактычна дэзавуяваў сваю згоду на прызнанне і адмовіўся прымаць прадстаўніцтва БНР. Маўклівае ці ўскоснае прызнанне БНР ажыццявілі Украінская Народная Рэспубліка, Германія, Чэхаславакія, Латвія, Эстонія. Аднак БНР не прызналі дзяржавы, якія вызначалі новы расклад сіл у Еўропе: Вялікабрытанія, Францыя і ЗША [8, с. 441–443].

ВРК БССР з'яўляўся часовым органам савецкай улады, які атрымаў паўнамоцтвы паводле Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці ССРБ 31 ліпеня 1920 г. У ёй адзначалася, што вышэйшая ўлада ў рэспубліцы будзе належыць ВРК да склікання Другога Усебеларускага

з'езда Саветаў. У прынятай ВРК дэкларацыі разам з канстатацыяй раўнапраўнага характару ўзаемаадносін паміж РСФСР і БССР заяўлялася аб перадачы Беларускай рэспублікай «на ўвесь час рэвалюцыйных войнаў» сваіх узброеных сіл у распараджэнне РСФСР, гатоўнасці ўзгадняць дыпламатычныя выступленні рэспублікі з дзеяннямі РСФСР, а таксама ўсталяваць адзіны гаспадарчы план з РФСР і іншымі савецкімі рэспублікамі [2, с. 166]. На самой справе, як паказалі наступныя падзеі, БССР фактычна добраахвотна падпарадкавала сваю знешнепалітычную дзейнасць інтарэсам Савецкай Расіі. Так рыхтавалася глеба аб прыняцці беларускімі бальшавікамі рашэнняў аб перадачы ўраду РСФСР паўнамоцтваў на вызначэнне меж Беларусі на мірных перамовах з Польшчай. У адпаведнасці з Дэкларацыяй аб абвяшчэнні незалежнасці ССРБ, ВРК валодаў вышэйшай уладай у рэспубліцы. Гэта быў надзвычайны орган улады на тэрыторыі, частка якой была вызвалена ад польскіх войскаў, а на іншай частцы адбываліся ваенныя дзеянні. Асноўным актам ВРК ССРБ быў загад, невыкананне якога разглядалася як невыкананне баявога задання. ВРК выдаваў таксама сумесныя акты з партыйнымі органамі – цыркулярныя лісты [9].

Важнае значэнне для разумення статуса дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі Беларусі, якія ўзніклі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г., маюць працы сучасных беларускіх даследчыкаў гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Заснавальнік беларускай школы гісторыкаў-прававедаў І.А. Юхо апублікаваў у 1993 г. смелы і наватарскі артыкул у "Беларускім гістарычным часопісе" пра паўнамоцтвы ўрадаў БНР і БССР у 1918–1921 гг. У ім абгрунтаваны канстытуцыйны і юрыдычны характар Трэцяй Устаўной граматы БНР ад 25 сакавіка 1918 г. і легітымнасць абвяшчэння незалежнасці БНР, што вынікала з рашэнняў Усебеларускага з'езда і дэкрэта СНК РСФСР аб несапраўднасці актаў аб падзелах Рэчы Паспалітай [12, с. 66]. Супрацьлеглым чынам адбываўся працэс канстытуіравання Беларускай савецкай рэспублікі, вырашальную ролю ў якім адыгрывала савецкая Расія. Паводле аўтара, урад РСФСР пасля адыходу немцаў з тэрыторыі Беларусі вырашыў стварыць тут "паслухмяны сабе ўрад" і ўтварэнне ўрада ССРБ адбывалася па рашэнні ЦК РКП(б), што ставіць пад пытанне яго паўнамоцтвы. Падводзячы выснову сваім разважанням, І.А. Юхо канстатаваў што

“адзіным законным беларускім урадам у 1918-1919 гг. быў Народны Сакратарыят Беларускай Народнай Рэспублікі, створаны Выканаўчым камітэтам Рады Усебеларускага з’езда на падставе яго рашэнняў” [12, с. 67].

І.А. Юхо разгледзеў юрыдычны статус БССР у 1920–1922 гг., які быў вельмі няпэўным і супярэчлівым. Фармальна яна лічылася незалежнай савецкай рэспублікай, а фактычна з’яўлялася аўтаномнай вобласцю РСФСР. Яе адносіны з РСФСР будаваліся не на раўнапраўных, федэратыўных пачатках, а на аснове аўтаноміі. Некаторае размежаванне кампетэнцыі паміж дзяржаўнымі органамі абедзвюх рэспублік адбылося пасля заключэння Дагавора аб ваенным і гаспадарчым саюзе паміж РСФСР і ССРБ ад 21 студзеня 1921 г. Выбраны на Другім Усебеларускім з’ездзе саветаў (снежань 1920 г.) урад (Савет Народных Камісараў) пад старшынствам А. Чарвякова ахарактарызаваны як “першы законна ўтвораны беларускі савецкі ўрад”, які ў сваёй большасці складаўся з беларускіх камуністаў-бальшавікоў і абараняў па меры сваіх сіл інтарэсы беларускага народа [12, с. 68]. Такой жа думкі прытрымліваюцца В.А. Круталевіч і І.А. Юхо ў сваім дапаможніку [6, с. 129], а таксама іншыя беларускія прававеды. У прыватнасці, М.У. Сільчанка і Р.Р. Байтасаў, прааналізаваўшы працэсы нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва на тэрыторыі Беларусі, прыйшлі да высновы, што “в 1919–1922 гг. Белорусская ССР не была независимым государством — она являлась составной частью Советской России, ее автономией. Органы, выполнявшие в разные годы функции правительства Советской Беларуси, были государственными органами республики, являющейся составной частью РСФСР” [9]. Гэтыя органы афармлялі рашэнні партыйных органаў, якія валодалі ўсёй паўнатой улады ў рэспубліцы. Уся практычная дзейнасць СНК БССР ажыццяўлялася пад кіраўніцтвам Цэнтральнага бюро КП(б)Беларусі, а рэальная ўлада знаходзілася ў руках цэнтральных органаў камуністычнай партыі, якой з’ялялася Расійская камуністычная партыя. Дзейнасць урада БССР мела ўвогуле фасадны характар [9].

Беларускія гісторыкі зараз разглядаюць працэсы стварэння БНР і БССР як адзіны непарыўны шлях развіцця беларускай дзяржаўнасці, як звёны аднаго ланцуга рэалізацыі права народа на самавызначэнне. Савецкае, сацыялістычнае звяно аказалася ў той момант мацнейшым за

нацыянальна-дэмакратычнае. І.М. Ігнаценка і С.М. Хоміч адзначаюць, што адсутнасць палітычнага адзінства нацыі і складаная знешнепалітычная сітуацыя абумовілі два магчымыя напрамкі самавызначэння Беларусі – БНР і БССР. Гэтыя дзве формы беларускай дзяржаўнасці пэўны час існавалі паралельна, атаясамліваючы сабой дзве альтэрнатывы, выбар паміж якімі павінен быў зрабіць беларускі народ. З двух варыянтаў гістарычнага развіцця лёсам і часам быў выбраны другі, савецкі напрамак. На думку гэтых аўтараў, «Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка стала своеасаблівай формай беларускай дзяржаўнасці, у якой правы рэспубліканскіх органаў улады з самага пачатку моцна ўрэзаны на карысць цэнтра» [4, с. 112]. Такім чынам Савецкая Беларусь нарадзілася з моцна ўрэзаным суверэнітэтам, што асабліва праяўлялася ў яе абмежаванай здольнасці да самастойнай знешнепалітычнай дзейнасці, аб чым будзе сказана ніжэй.

Найбольш выразна дыпламатычная залежнасць Мінска ад Масквы праявілася падчас савецка-польскіх мірных перагавораў 1920 г. У жніўні-верасні ВРК БССР прыняў некалькі пастаноў аб выдачы РСФСР мандата на вядзенне перагавораў з Польшчай [1, с. 155–156; 11, с. 23–25]. Самая вядомая з іх – гэта пастанова ад 10 верасня 1920 г., якая прадугледжвала выдаць РСФСР “самы шырокі мандат на вядзенне мірных перагавораў з Польшчай па пытанню, галоўным чынам, вызначэння меж Беларусі” [3, с. 195]. Гэта азначала, што беларускі савецкі ўрад даваў згоду на падзел Беларусі, што і было потым зафіксавана ў Рыжскім мірным дагаворы, падпісаным РСФСР і УССР, з аднаго боку, і Польшчай з другога. У прэамбуле дагавора адзначалася, што ўрад РСФСР падпісвае дагавор “за сябе і па ўпаўнаважанні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліці” [3, с. 254–255; 10].

Пытанні прававога і палітычнага статуса Беларусі і яе прызнання (без згадвання назваў дзяржаўных утварэнняў) неаднаразова ўздымаліся на савецка-польскіх перагаворах. У заяве Усерасійскага цэнтральнага выканаўчага камітэта (УЦВК) ад 23 верасня 1920 г. гаварылася, што, зыходзячы з поўнага прызнання прынцыпу самавызначэння, РСФСР ужо ў 1917 г. прызнала незалежнасць і суверэннасць Польскай рэспублікі, у 1918 г. – незалежнасць і суверэннасць Украіны і Беларусі*, а ў 1920 г. падпісала мірны дагавор з

---

* Гэта была прапагандысцкая нацяжка, бо ў 1918 г. і пазней РСФСР не прызнавала незалежнасці абвешчанай тады БНР. Што датычыла БССР, то яе

незалежнай і суверэннай Літоўскай рэспублікай. УЦВК прапаноўваў пакласці ў аснову мірнага пагаднення, па-першае, пацвярджэнне як Польшчай, так і Расіяй незалежнасці Украіны, Літвы і Беларусі і прызнанне незалежнасці Усходняй Галіцыі, па-другое, афіцыйнае прызнанне імі дзяржаўных прадстаўніцкіх устаноў (соймаў, парламентаў, з’ездаў саветаў), створаных у кожнай з гэтых краін [3, с. 204–206].

На пасяджэнні Галоўнай камісіі 1 кастрычніка старшыня польскай дэлегацыі Я. Домбскі адрэагаваў на патрабаванне расійска-ўкраінскай дэлегацыі аб прызнанні Польшчай палітычнага ладу, які савецкая Расія ўсталявала на беларускіх і ўкраінскіх землях. Ён сказаў, што Польшча, прызнаючы права кожнага народа самастойна вырашаць свой лес, «не можа прызнаць сапраўдным і свабодным волевыяўленнем народа ўладу, навязаную сілай расійскіх савецкіх войскаў, забяспечанай прызначэнымі з Масквы камісарамі, якія неаднаразова фігуруюць перш-наперш як упаўнаважаныя Савецкай Расіі, а потым фігуруюць як прадстаўнікі волі мясцовага насельніцтва» [13, s. 100].

Польская дыпламатыя абвергла тэзіс расійскай дэлегацыі аб нібыта самастойных, а на самай справе цалкам залежных ад РСФСР савецкіх тэрытарыяльных арганізацыях (савецкіх рэспубліках), за якім выразна хавалася жаданне замаскавацца пад новай формай былых захопаў, якія здзяйсняла царская Расія разам з Аўстрыяй і Прусіяй. Я. Домбскі, маючы на ўвазе БССР, сцвярджаў, што «савецкая Беларусь не мае ніякіх аб’ектыўных рыс самастойнасці і дзяржаўнай незалежнасці». Ён таксама выказваў сумненне, ці мае такія рысы і савецкая Украіна. Кіраўнік польскай дэлегацыі таксама казаў, што савецкая Расія распарадзілася Віленскай і Гродзенскай губернямі, дзе «несумненна пражывае польская большасць», нібыта сваёй законнай уласнасцю, не пытаючыся волі мясцовага насельніцтва [13, s. 100]. Ён аднак не пажадаў далей развіваць гэту тэму, паколькі пытанне аб лёсе гэтых зямель павінна было належаць непасрэднаму ўрэгуляванню паміж Польшчай і Літвой.

Польская дэлегацыя, як і савецкая, таксама дапускала прапагандысцкія сцвярджэнні наконт прызнання незалежнасці новых дзяржаў на тэрыторыі “ўсходніх крэсаў”. Я. Домбскі казаў, што

---

незалежнасць была прызнаная РСФСР 31 студзеня 1919 г. пастановай Прэзідыўма УЦВК [1, с. 103–104].

Польшча, не чакаючы ініцыятывы з боку Расіі, прызнала незалежнасць Літвы, Украіны і Беларусі [13, s. 100]**. У той жа час Расія не дала рэальнай гарантыі незалежнасці Беларусі і Украіны, акрэслення іх усходніх і паўночных меж, правядзення свабодных сходаў – пасля адыходу расійскіх войскаў – канстытуантаў (устаноўчых сходаў) гэтых краін, выбраных роўным, тайным, усеагульным, прамым, прапарцыянальным галасаваннем, не адмовілася ад спынення рэпрэзентацыі гэтых дзяржаў Расіяй на міжнароднай арэне. Кіраўнік расійска-ўкраінскай дэлегацыі А. Іофэ адказаў, што яна прымае да ведама факт прызнання Польшчай незалежнасці Украіны, Літвы і Беларусі, але не можа не нагадаць таго, што гэта прызнанне ў перыяд польскай акупацыі не перашкаджала кіраваць гэтымі землямі прызначанымі з Варшавы камісарамі і шляхам тэрору [13, s. 102]. Міжнародна-прававога прызнання Польшчай ні БНР, ні тым больш ССРБ або ЛітБел, з якімі Варшава наогул не жадала мець ніякіх спраў і не адказвала на іх тэлеграмы, не было [7, с. 12].

Актыўнасць урада і дэлегацыі БНР у Рызе мела важнае значэнне, бо прымусіла расійскі НКЗС ушчыльную займацца беларускім пытаннем, што мела сваім вынікам прыезд А. Чарвякова ў Рыгу, каб супрацьпаставіць яго ўраду В. Ластоўскага. Яшчэ адным вынікам намаганняў гэтага ўрада можна лічыць пастаноўку расійскай дыпламатыяй пытання аб прызнанні незалежнасці Беларусі (ССРБ), што знайшло пазней адлюстраванне ў прэлімінарным мірным дагаворы. На рахунак актыўнасці ўрада БНР верагодна можна аднесці і згаданую вышэй прапагандысцкую фразу з заявы УЦВК ад 23 верасня 1920 г. аб прызнанні ў 1918 г. незалежнасці Беларусі (БНР), чаго фактычна не было [11, с. 28–30].

Паводле негалоснай дамоўленасці паміж Масквой і Варшавай, было вырашана не дапусціць БССР на мірныя перагаворы, паколькі ўвядзенне чацвёртай дэлегацыі перакулівала б, як прызнаваўся Г. Чычэрын, расійска-польскія дыпламатычныя камбінацыі. ВРК БССР выдаў савецкай дэлегацыі мандат на вядзенне перагавораў і ўпаўнаважыў РСФСР на падпісанне мірнага дагавора ад імя БССР. Гэта

---

** Гэтае сцвярджэнне вернае адносна Літвы і Украіны. Што датычыцца Беларусі, то Польшча прызнала Беларусь толькі паводле Рыжскага мірнага дагавора, падпісанага 18 сакавіка 1921 г. Пры гэтым пад Беларуссю мелася на ўвазе Беларуская ССР, хаця ў тэксце дагавора (арт. II) гаварылася менавіта пра прызнанне незалежнасці Беларусі без аніякага ўпамінання назвы дзяржавы.

было праявай палітычнай слабасці і нацыянальнага нігілізму гэтага часовага рэвалюцыйнага органа Беларускай савецкай рэспублікі, якая тады ахоплівала толькі Мінскую губерню. Працэс умацавання БССР паскорыўся пасля падпісання Рыжскага мірнага дагавора. Мірныя перагаворы нанеслі моцны ўдар па разліках і спадзяваннях дзеячаў БНР на ўдзел у іх у якасці раўнапраўнага боку. Не былі рэалізаваны іх надзеі на падтрымку польскай дэлегацыі ў справе стварэння суверэннай беларускай дзяржавы [7, с. 16–17]. Заявы кіраўнікоў савецкай і польскай дэлегацый аб прызнанні незалежнасці Беларусі мелі прапагандысцкі характар і не суправаджаліся адпаведнымі крокамі па дапушчэнні дэлегацый БССР і БНР на перагаворы.

Рыжскі мірны дагавор стаў першым легітымным міжнародна-прававым актам XX ст., які замацаваў за Беларуссю (назвы дзяржавы ў тэксце не дадзена) і беларускім народам шэраг важнейшых атрыбутаў дзяржаўнасці і нацыянальных правоў. Дагаворныя бакі прызнавалі незалежнасць Беларусі, як і Украіны, што давала падставы Маскве і Мінску лічыць, што гэта азначае прызнанне менавіта БССР, бо камуністы кантралявалі тэрыторыю рэспублікі, а ўрад БНР знаходзіўся ў эміграцыі. Прызнанне Польшчай незалежнасці Украіны і Беларусі азначала, што Польшча стала першай заходняй дзяржавай, якая прызнала БССР дэ-юрэ і пацвердзіла гатоўнасць ўсталяваць з ёй дыпламатычныя адносіны. Аднак хуткае стварэнне Саюза ССР паставіла крыж на надзеях Мінска абмяняцца пасольствамі з Варшавай.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Бароўская, В.М. Беларускае пытанне на савецка-польскіх перагаворах 1918-1921 гг. Мінск: Беларуская навука, 2017.

2. Документы внешней политики СССР: В 24 т. / редкол.: Г. А. Белов [и др.]. М., Госполитиздат, 1959. Т. 3 (1 июля 1920 г. – 18 марта 1921 г.).

3. Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў: У 10 т. Рэд. кал.: І.І. Антановіч (старшыня) [і інш.] Мінск: БелНДІДАС, 1997. Т. 1 (1917–1922 гг.).

4. Ігнаценка І., Хоміч С. Утварэнне БССР // Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / Рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. Мінск: Экаперспектыва, 2006. С.105–112.

5. История белорусской государственности. В 5 т. Т. 1: Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. / А.А. Коваленя [и др.]; отв. ред. тома: О.Н. Левко, В.Ф. Голубев. Минск: Беларуская навука, 2018.

6. Круталевіч, В.А., Юхо, Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917–1945 гг.): вучэб дапам. для студ. юрыд. і гіст. спец. ВНУ. 2-е выд. Мінск: Беларуская навука, 2000.

7. Мэтэрскі, В. Польшча, Беларуская Народная Рэспубліка, Рыжскі дагавор // Рижский договор: взгляд через столетие: сборник научных статей / редкол.: Н.Н. Мезга (гл. ред.) [и др.]. Гомель: ГГУ им. Ф. Скорины, 2021. С. 11-18.

8. Міхалюк, Д. Беларуская Народная Рэспубліка ў 1918–1920 гг.: Ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці. Смаленск: Інбелкульт, 2015.

9. Сильченко, Н.В., Байтасов, Р.Р. Правовая природа актов органов, выполнявших функции правительства Белорусской ССР в 1919–1922 гг. // Право и демократия. сб. науч. трудов. вып. 9. Минск: Право и экономика, 1998. С. 74–83.

10. Снапкоўскі, У.Е. Аб мандаце ВРК ССРБ, выдадзеным ураду РСФСР па пытанні вызначэння меж Беларусі // Да 90-годдзя прыняцця Рыжскага дагавору 1921 г.: матэрыялы з гісторыі польска-беларускіх узаемаадносін у ХХ ст.: зборнік навуковых прац III міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі. Мінск, 9–10 чэрвеня 2011 г. Навук. рэд. Е. Расоўска, А. Вялікі. Мінск: ТАА “Ковчег”, 2011. С. 241–255.

11. Снапкоўскі, У.Е. Шлях скрозь стагоддзе: беларуска-польскія адносіны 1918-2017 гг. Мінск: БДУ, 2017.

12. Юхо, Я. Беларускія ўрады 1918–1921 гг. і іх паўнамоцтвы // Беларускі гістарычны часопіс. 1993. № 4. С. 63-68.

13. Dąbski, J. Pokój ryski. Wspomnienia, pertraktacje, tajne układy z Joffem, listy z 15 ilustracjami i 1 mapę. Warszawa: Druk zakładów gragicznych i wydawniczych W. Kulerskiego w Grundziądzu, 1931.